*Дар'я Алексенка*

# НЯБЕСНЫЯ АБ'ЕКТЫ Ў НАРОДНЫМ КАЛЕНДАРЫ БЕЛАРУСАЎ

Важнай тэмай, якая здаўна прыцягвае ўвагу даследчыкаў і зараз не страціла сваёй актуальнасці з'яўляецца народны каляндар. Прычыну гэтага, як нам уяўляецца, трэба шукаць у самім феномене народнага календара, які, на думку даследчыкаў складае ядро ўсёй традыцыйнай культуры [9, с. 9], найбольш поўна адлюстроўвае традыцыйны светапогляд, дазваляе глыбей разумець рознабаковыя аспекты народнага светаўспрымання [10, с. 8].

Як з'ява этнакультуры народны каляндар грунтуецца на арганічнай лучнасці чалавечай адзінкі, соцыуму ў цэлым з космасам, касмічнымі рытмамі. У дадзеным артыкуле на прыкладзе аднаго са стражытнейшых кампанентаў традыцыйнага календара беларусаў – прыкмет і павер'яў – паспрабуем выявім узаемасувязь чалавечага існавання з важнейшымі элементамі касмічнай сістэмы – месяцам, зоркамі.

Усебаковае асэнсаванне найбольш агульных законаў будовы традыцыйнага календара беларусаў паказвае, што старажытная сістэма структуравання часу засноўвалася не толькі на руху Сонца. Вялікі ўплыў на яе аказвала і другое нябеснае свяціла – Месяц. А. Лозка, заўважае, што «найстаражытнейшыя меры часу месяцавыя («лунныя»)» [7, с. 5]. У сувязі з тым, што чаргаванне квадраў месяца адбываецца з выключнай дакладнасцю і паслядоўнасцю, месяц становіцца «мерай рытмічных змяненняў», «усеагульнай меркай». М. Эліадэ звяртае ўвагу, што «самы старажытны індаеўрапейскіі корань, які адносіцца да нябесных свяцілаў, абазначае Месяц – те; у санскрыцкім ён дае слова mami, «вымяраю» [12, с. 154]. А. Жураўлёў адзначае, што акрамя традыцыйнай матывацыйнай сувязі наймення месяца (прасл. **mesecь*) з паняццем "мерыць" існуюць і іншыя пункты погляду на яго этымон, «напрыклад, узвядзенне, у сувязі з пераменлівасцю аблічча месяца, да значэння "мяняць(ца)" (пар. прасл. **men* – з індаеўрап. **moin*) ці "меншы, памяншацца" (праслав. **mьn'es* – з індаеўрап. **men(i)osi*)» [3, с. 65]. У беларускай традыцыі існуе павер'е, паводле якога Бог загадаў месяцу перанараджацца кожныя чатыры тыдні, за тое, што ён дрэнна свяціў ноччу: «*От затым ён адну нядзелю малады, другую расце аж да поўна, трэйцюю поўны, а чацьвортую саўсім прападае*» [6, с. 49].

Базай для ўзнікнення народнага календара беларусаў, а таксама каляндарных свят, звычаеў і абрадаў паслужыў статоўны гаспадарчы вопыт народа. Аб працоўных вытоках каляндарных звычаеў і абрадаў С. Токараў пісаў: «Калі глянуць на іх быццам бы з вялікай вышыні, з агульнасацыялагічнага пункту гледжання, то мы ўбачым, што ў гэтых абрадах адлюстравана своеасаблівая адаптацыя чалавечай дзейнасці да аб'ектыўнага, гэтак мовіць, касмічнага рытма прыроды… У аснове гадавога цыкла каляндарных абрадаў і вераванняў ляжыць сялянская праца, матэрыяльная вытворчасць» [8, с. 16].

Адным са старажытнейшых кампанентаў традыцыйнага календара беларусаў, калі не самым даўнім яго кампанентам з'яўляюцца прыкметы і павер'і. Вядомы цэлы комплекс народных павер'яў, якія рэгламентуюць сельскагаспадарчыя работы ў залежнасці ад касмічных рытмаў, асаблівым чынам звязаных з квадрамі Месяца. У маладзіковы перыяд прынята пачынаць сяўбу, касьбу або жніво, а таксама ставіць вуллі, на трэці дзень маладзіка – прышчэпліваць дрэўцы [6, с. 51]. За найлепшую пару месяца лічылі канец другой квадры (поўню), бо ён быў спрыяльны для заканчэння работ і складання запасаў. Заўважалі, што перад поўняю самы лепшы час калоць кабаноў, лягчаць жарабцоў, бычкоў, кабанчыкаў, каб паўнелі; саджаць птушак на седала, сячы лес на будоўлю, а галоўнае – хату закладваць, каб была поўнаю чашаю [6, с. 50]. Трэці тыдзень (*гнілуха*) лічыўся найлепшым часам для знішчэння шкодных насякомых і чарвякоў на агародзе [6, с. 52].

З квадрамі месяца звязвалася і ўрадлівасць расліннага свету. Як адзначае М. Эліадэ, «гэтае адвечнае вяртанне да першапачатковых формаў, гэтае бясконцае чаргаванне ператвараюць Месяц у свяціла жыццёвых рытмаў па перавазе. А таму не дзіўна, што Месяц кіруе усімі касмічнымі сферамі, падпарадкаванымі закону цыклічнага станаўлення: водамі, дажджом, раслiннасцю, урадлівасцю» [12]. Так, *на маладзіку* нельга нічога сеяць і садзіць, бо пасеянае будзе кепска даспяваць, «*будзе маладжава*» [6, с. 51], агуркі, гарбузы, гарох, боб і мак будуць цвісці пустацветам [6, с.50]. Лепш рабіць гэта пад «*поўны*», калі міне першая квадра.

У народным календары беларусаў захавалася вялікая колькасць прыкмет, скіраваных на прагназаванне будучага ўраджаю паводле нябесных аб'ектаў – у пераважнай большасці зорак: «*…шмат зорак прадказвае добры ўраджай на збожжа і на добрае надвор'е на сенакос, мала зорак на небе – благі ўраджай і дрэннае надвор'е ў час сенакосу*» [4, с. 329]. «*Калі ўвечары неба яснае і засеянае зоркамі, гэта, паводле старадаўніх меркаванняў, прадказвае лета, багатае на грыбы*» [4, с. 329]. У цэнтры ўвагі прыкмет аказваецца такая асаблівасць нябеснага аб'екта, як частотнаць. Ва ўяўленнях беларускага селяніна зоркі інтэрпрэтуюцца ў якасці знака добрага, багатага ўраджаю ў сілу сваёй множнасці і незлічонасці, пар.: «*Многа як (зораў) на небе*» [2, с. 347]. Пры прадказанні ўраджаю становіцца важным нават і той факт, у якім накірунку лакалізуюцца зоркі на небе: «*у якім баку больш зорак, там будзе больш і грыбоў*» [4, с. 329].

Даволі часта прыкметы прывязвалі да каляднага перыяду, які аб'ядноўваў галоўныя зімовыя святы (Каляды, Новы год, Крашчэнне) і які надзяляўся асаблівымі сакральнымі характарыстыкамі. У. Чычараў адзначаў, што «калядная навагодная абраднасць… як бы злучала стары і новы год, завяршала адзін і адчыняла другі; яна пачыналася ў канцы старага года, і ў яе сістэме вялікую ролю адыгрывала «магія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першага дня», якая праецыравала жадаемы дабрабыт на ўвесь наступны прамежак часу» [11, с. 22]. А таму для селяніна важнае значэнне мелі «паказанні» зорнага неба менавіта ў святы зімовага цыкла: «*Па большай ці меншай колькасці зорак у гэтую Каляду, а таксама і ў іншыя (г. зн. напярэдадні Новага года і Вадохрышча) можна вызначыць ураджай грыбоў, ягад і арэхаў, прычым першая каляда паказвае на іх ураджай у пачатку лета, другая (13 студзеня) – у сярэдзіне і апошняя (18 студзеня) – у канцы лета. Тое самае і з раеннем пчолаў*» [4, с. 330]. «*Густыя зоркі на першую куццю прадказваюць ураджай ячменю, на другую – проса, на трэцюю – грэчкі*» [4, с. 330].

Колькасць зорак на небе ў прыкметах прадказвае не толькі багаты ўраджай, але і вызначае, які будзе прыплод жывёлы ў будучым годзе: «*калі шмат зорак на небе – добры прыплод, мала зорак – кепскі*» [4, с. 329]. Паводле запісаў, зробленых Э. Азім-Задэ ў Пінскім р-не, прыплод авечак напрамую залежаў ад выгляду зорнага неба: «*на пэршу кут"у нэма зорі, дівіс"а тэпэр молодн"аку нэ будэ*» [1, с. 99]. У падобным кантэксце Э. Азім-Задэ заўважае, што ў шэрагу загадак усходне-, заходнеславянскіх традыцый зоркі ўвасабляюцца ў выглядзе авечак. Гэта характэрна і ў дачыненні да беларускіх загадак: «*Адзін пастух пасе тысячу авец*» [5, № 76]. Далей даследчык працягвае: «зоркі загадваюцца як аб'ект, выражаны або множным лікам (авечкі, пчолы), або зборным назоўнікам (гарох, проса). Не выключана, што варожбы па зорках таксама звязваліся з гэтым прынцыпам кадзіравання: з сельскагаспадарчых аб'ектаў выбіраюцца менавіта тыя, што валодаюць уласцівасцю быць недыферынцаваным мноствам (ягады, жыта і г.д.)» [1, с.100].

Такім чынам, у прыкметах і павер'ях – адным з важнейшых і старажытнейшых кампанентаў народнага календара беларусаў – яскрава выяўляецца ідэя узаемасувязі чалавека з касмічнай сферай, а таксама залежнасць яго гаспадарчай дзейнасці ад касмічных рытмаў, своеасаблівым чынам звязаных з квадрамі Месяца.

**Спіс літаратуры:**


1. Азим-заде, Э.Г. К сопоставительному анализу славянских и тюркских названий созвездий / Э.Г. Азим-заде // Советское славяноведение. – 1980. – № 1. – С. 96–104.
2. Выслоўі / склад. М.Я. Грынблат. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.
3. Журавлев, А.Ф. / Язык и миф. Лингвистический комментарий к труду А.Н. Афанасьева «Поэтические воззрения славян на природу» / А.Ф. Журавлев. – М. : Индрик, 2005. – 1004 с.
4. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – Кн. 2. – 607 с.
5. Загадкі / склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 363 с.
6. Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад. прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 2010. – Кн. 1. – 574 с.
7. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Полымя, 2002. – 239 с.
8. Токарев, С.А. Народные обычаи календарного цикла в странах Западной Европы (опыт структурно-исторического анализа) / С.А. Токарев // Советская этнография. – 1973. – № 6. – С. 15–29.
9. Толстая, С.М. Полесский народный календарь / С.М. Толстая. – М: Индрик, 2005. – 600 с.
10. Фурсова, Е.Ф. Обычаи и обряды зимне-весеннего периода / Е.Ф. Фурсова. – Новосибирск: Ин-т арх. и этногр. СО РАН, 2002 – 286 с.
11. Чичеров, В.И. Зимний период земледельческого календаря XVI – XIX веков / В.И. Чичеров. – М.: Изд-во Академии наук СССР, 1957. – 236 с.
12. Элиаде, М. Трактат по истории религий: в 2 т. / М. Элиаде. – СПб.: Алетейя, 1999. – Т. 1. – 400 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ